Крот Аляксандра Аляксандраўна

"АДЗІНСТВА" - дылогія.

1. НА ДРУГІМ БЕРАЗЕ...

(прысвячаецца маім дзядулі і бабулі - выдатнікам Народнай Асветы БССР, дырэктару і заснавальніку Гальшанскай СШ Кроту Міхаілу Сцяпанавічу (выкладчык рускай мовы) і Кулагінай Паліне Адамаўне, настаўніцы беларускай мовы і літаратуры. У літаральным сэнсе дзядуля сустрэў каханне і лёс на "другім беразе", у Заходняй Беларусі, дзе і застаўся на ўсё жыццё. Дзядуля і бабуля праводзілі грамадскую і асветніцкую працу ў рэгіёне, дзе з мясцовага насельніцтва "за польскім часам" і пры нямецкіх акупантах спрабавалі сцерці беларускую нацыянальную памяць і культуру. Цікава, што фільм пра тыя жорсткія часы "На другім беразе", назва якога стала лейтматывам да майго вершу, здымаўся ў натурных дэкарацыях гістарычных будынкаў маіх родных Гальшан! За гэта здымачнаму гурту "Беларусьфільма" асабісты "дзякуй"! На прыкладзеным фотаздымку - мая бабуля, артыкул з "Настаўніцкай газеты" за 1981 г.)

***

На другім беразе,

Як крылы ветразю,

З табой мы сустрэліся -

Праўдай і Смеласцю,

Верай, Сумленнасцю...

Як можна было

Тыя межы ўскласьці

Па сэрцу, сумленню,

Па нашаму шчасцю?!

Ня стала мяжы.

Мы сустрэцца змаглі -

На другім беразе,

Як крылы ветразю!

І раніцай шэраю,
Пад клёкат буслiны,
Мы выйшлі насустрач -
Мы гэтым жылі!

Лісьцё чырванела...
Пакрочылі смела,
Па вольнай, адзінай і
Роднай зямлі!

І сталі вучыць мы
На мове народнай,
Будзіць пакаленне
Ад цемры нягоднай.

Як помнік на ўзвышшы -
Гальшанская школа,
Ёй дзякуй, што піша
Ўсё наваколле!

... Так вырашыў лёс
Тых мясцінаў дзядуля.
Вяртаўся з вайны -
Усіх бяда закранула.

І Верасень...
Гэта ня толькі вучоба!
Гэта - наш лёс, "і выток,
І аснова!"...

2. НЕ ГАЛАСІ!...

(Зварот да маладога пакалення, якое часта, не маючы жыццёвага вопыту, трапляе ў палонкі небяспечных інфармацыйных падманак і маніпуляцый. Страціўшы пільнасць, сумленнасць і павагу да Радзімы, яе лёгка згубіць назаўсёды... Наша дзяржава будавалася праз цяжкія выпрабаванні, і абыякава ставіцца да яе - гэта значыць, не шанаваць плённую працу нашых дзядоў. У дзень Народнага Адзінства - 2026 някепска ўсвядоміць пагрозу 2020 года, нашага сапраўднага выпрабавання на Адзінства і вернасць Радзіме.

Верш пакладзены на аўтарскую музыку).

Не галасі!...

Галасіць анягожа

Па тым, што ня праўдзіць,

Па тым, што ня можа

Цябе ўлекаваць ці да Праўды

Прызваць

-

Па марам пустым, нават вельмі прыгожым

- Не галасі!

Не галасі!...

Не галасі!

Не турбуй Паднябессе,

Грамчэй, чым зязюля кувае ў лесе!

Маркоту сваю за плячыма ня носяць -

Няхай жа буслы твае думкі галосяць! -

Не галасі!...

Не галасі!

Галасіць анягожа

Па тым, што ня праўдзіць,

Па тым, што ня можа

Цябе ўлекаваць ці да Праўды

Прызваць

-

Па марах пустых, нават вельмі прыгожых

- Не галасі!

Не галасі!...

У голас крычы,

Калі вораг прыходзіць!

Змаўчыш - і зямля твая

Хлеб не народзіць!

Абшар агалошвай

Жыровіцкім звонам -

Калі не ў сечы,

Дык у працы будзь плённым!

Тады - галасі! -

Усіх грамчэй

І нястомна!

Ты чуеш? Пабеглі

На ворага коні!...

І ты не спыняйся ў

гэтай пагоні,

Грамчэй галасі

Перамогі каноны!

Не галасі!...

Галасіць анягожа

Па тым, што ня праўдзіць,

Па тым, што ня можа

Цябе ўлекаваць ці да Праўды

Прызваць

-

Па марах пустых, нават вельмі прыгожых

- Не галасі!

Не галасі!...



Звыш трыццаці гадоў працуе на педагагічнай ніве П. А. К
лагіна, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Гальшанск
сярэдняй школы Ашмянскага раёна. За выдатную і плённ
работу па выхаванню падрастаючага пакалення Паліна Адам
на ўзнагароджана граматамі аблана і Міністэрства асветы БС
НА ЗДЫМКУ: П. А. КУЛАГІНА.

Фота А. Сасіноўскага

«Настаўніцкая газета», 11.07.1981 г.